"Заря". - 2021 - 1 верасня (№167). - С.11

Па дарозе



# СПАДЧЫНА ПАЛЕССЯ,
## або Экспазіцыя без шкла

**Пінск можа стаць адным з пунктаў разнастайных турыстычных маршрутаў. Напрыклад, па дарозе да яго можна пабываць у заказніках, прайсціся экалагічнымі сцежкамі, наведаць старажытныя паркі Парэчча, Дубое, Сташаны, паназіраць, як вырошчваюць і збіраюць ягады на прадпрыемстве «Палескія журавіны», даведацца, як працуюць шлюзавыя камеры на гідравузле «Дубой», ці здзейсніць пераправу праз раку Піну, прычым тут усё выконваецца ўручную, можна нават паспрабаваць свае сілы ў перацягванні парома пры дапамозе спецыяльнага драўлянага прыстасавання — палкі-гамаркі.**

А яшчэ Піншчына вяртае тое, што, на жаль, сёння страчана ў гарадскім асяроддзі — традыцыі, рамёствы, абрады, веды і эмоцыі, з імі звязаныя. З мэтай захавання этнаграфічнай памяці, у вёсцы Мерчыцы быў створаны Цэнтр традыцыйнай культуры «Спадчына Палесся». Тут можна выпрабаваць сябе за ткацкім станком, паўдзельнічаць у танцавальных калектывамі яны здольныя прыдумаць праграмы пад самых розных гасцей — ад малога да вялікага.

Асаблівасць Піншчыны ў тым, што гарадскія і раённыя ўлады разам працуюць на развіццё турыстычнай прывабнасці рэгіёна. **Намеснік старшыні раённага выканкама Дзмітрый ПАЛХОЎСКІ** адзначыў, што сёння тут стараюцца развіваць розныя віды адпачынку: гэта і гістарычныя вандроўкі, агратурызм, экалагічны, веласіпедны, медыцынскі, водны (сплавы па Прыпяці і прагулкі на цеплаходзе). Тут можна запускаць і аграпрамысловы турызм: у раёне рэканструявалі малочнатаварныя комплексы, дзе можна паглядзець новыя тэхналогіі вытворчасці малака і мяса. Ёсць задумкі новых камбінаваных маршрутаў з коннымі паходамі, экскурсіяй па Пінску і катаннем на цеплаходзе.

**Загадчык сектара турызму ўпраўлення спорту і турызму Брэсцкага абласнога выканкама Дзяніс НІКІЦЮК** *упэўнены, што* Палессе неабходна прасоўваць як адзіны турыстычны рэгіён і стаўку рабіць на неаднадзённыя, насычаныя наведваннем розных пунктаў маршруты.

майстар-класах ці навучыцца гуляць у народныя гульні. У шасці залах музея сабрана больш за 200 экспанатаў, якія распавядаюць пра побыт палешукоў. «Нашы экспазіцыі не маюць шкла. Мы спецыяльна рабілі цэнтр такім, каб людзі тут маглі акунуцца ў побыт, адчуваць сябе так, быццам знаходзяцца ў сапраўднай вясковай хаце, маглі дакрануцца да прадметаў, вярнуцца да вытокаў, адчуць сваю сувязь з папярэднікамі», — падзяліліся **загадчык Мерчыцкага цэнтра традыцыйнай культуры і побыту Таццяна ВАКУЛІЧ.** Усе госці цэнтра становяцца сапраўднымі ўдзельнікамі старадаўніх традыцый: удзельнічаюць у Калядках, спальваюць чучала і водзяць карагоды на Масленіцу, качаюцца ў расе і просяць у Бога здароўя на Юр'е, частуюцца напоем на зёлках, тут жа сабраных... У час пандэміі тут апрабавалі сямейныя экскурсіі. На народныя святы можна дамовіцца, і вашым дзеткам арганізуюць сапраўдныя палескія прыгоды.

Падобныя цэнтры на Палессі развіваюцца, і ў супрацоўніцтве з мясцовымі рамеснікамі, фальклорнымі

Прычым турыстычныя вандроўкі, якія вядуць у Пінск, могуць праходзіць не толькі праз Пінскі, але і праз Драгічынскі, Іванаўскі раёны, дзе ўжо створаны цікавыя аб'екты. Пазней плануецца далучыць сюды Лунінецкі і Столінскі раёны. На жаль, сёння праблема ўпіраецца ў недахоп аб'ектаў размяшчэння, і нават аграсядзібы не здольныя закрыць праблему з рассяленнем турыстаў на начлег. Адна справа — калі госці прыязджаюць на сваіх машынах сем'ямі, іншая — калі вялікія патокі турыстаў вязуць аўтобусамі. Важна фарміраванне сістэмы кіравання падобнымі праектамі і інфармацыйнага забеспячэння новага прадукту. На Піншчыне плануецца стварыць адзіны інфармацыйны цэнтр.

Будучыня і за турыстычнымі кластарамі, калі розныя аб'екты (сядзібы, лясгасы, турпрадпрыемствы, мясцовыя творчыя калектывы, музеі) працуюць на стварэнне адзінага прывабнага прадукту, які забяспечыць гасцей адкрыццямі, уражаннямі, забавамі і дазволіць затрымаць іх на больш працяглы час.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

